Полесская правда

Да 100-годдзя заснавання БССР

# Гістарычная сувязь часоў

**У чытальнай зале Пінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Я. Янішчыц адбылося раённае мерапрыемства, прысвечанае 100-годдзю з дня ўтварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.**



Выступае Таццяна Цімафеева.

Ганаровымі гасцямі свята сталі начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пінскага райвыканкама Л.В. Галавач, старшыня Пінскай раённай арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў М.С. Заранка, намеснік старшыні раённай ар-



Успамінамі дзеліцца Міхаіл Заранка.



ганізацыі РГА «Белая Русь», галоўны рэдактар раённай газеты «Палеская праўда» В.М. Падлужная.

Вядучыя свята – супрацоўнікі бібліятэкі Кацярына Міхалевіч і Крысціна Шэлеговіч нагадалі прысутным, што са знамянальнай датай звязана цэлая эпоха ў гісторыі нашай дзяржавы, эпоха нацыянальнага адраджэння беларускага народа, усіх сфер жыцця беларускага грамадства. За гады свайго існавання рэспубліка прайшла складаны і драматычны шлях свайго развіцця, пераўтварылася з адсталай аграрнай ускраіны былой царскай Расіі ў высокаразвітую савецкую рэспубліку. Менавіта ў перыяд БССР быў закладзены трывалы грамадска-палітычны, эканамічны і культурны падмурак беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, які вытрымаў выпрабаванне часам, стварыў надзейны грунт будавання суверэннай Рэспублікі Беларусь.

Свой погляд на жыццё ў час БССР і сувязь таго часу з часам сённяшнім выказаў Міхаіл Заранка і павіншаваў усіх са знакавым юбілеем.

Разам з вядучымі госці свята, большасць з якіх давялося жыць у БССР, успаміналі старонкі гісторыі Піншчыны, імёны выбітных яе прадстаўнікоў – Герояў Сацыялістычнай Працы, Ганаровых грамадзян Пінскага раёна.

Святочны настрой на мерапрыемстве стваралі музычныя нумары ў выкананні салістаў Мікалая Саўчанчыка, Ганны Рыжко, Таццяны Цімафеевай, народнага ансамбля народнай песні «Верас» Малоткавіцкага ЦСДК.

Увазе аўдыторыі былі прадстаўлены мультымедыйная прэзентацыя «100 год з дня ўтварэння БССР», а таксама тэматычная кніжная выстава.

**Кацярына АБРАМЧУК.**
**Фота аўтара.**